# Смаргонь у гады Вялікай Айчыннай вайны

Аўчарэнка А. В.
Навуковы кіраўнік канд. гіст. навук, дацэнт Бяляеў А. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

На чацвёрты дзень вайны, у сераду 25 чэрвеня, фашысты наблізіліся да Смаргоні. Вайскоўцы, што знаходзилися щ горадзе, правялі мітынг, на якім кляліся мужна змагацца з фашыстамі, абараняць сваю Радзіму. Ва ўсіх сельсаветах, арганізацыях і ўстановах прайшлі мітынгі і сходы, на якіх працоўныя выказвалі абурэнне агрэсіяй і выражалі ўпэўненасць у хуткім разгроме гітлераўскіх захопнікаў. І роўна ў 21 гадзіну 52-і процітанкавы дывізіён пакінуў горад. У Смаргоні засталіся толькі вайскоўцы для правядзення мабілізацыі.

Згодна з Пастановай ЦК КП(б)Б ад 22.6.1941 г. «Аб задачах і мерапрыемствах у сувязі з выступленнем па радыё намесніка старшыні СНК СССР В. М. Молатава» ў Смаргонскім раёне былі зроблены захады па тэрміновым пераводзе ўсяго жыцця на ваенны лад.

Смаргонскі раён быў акупіраваны фашыстамі ўжо на 4-ы дзень вайны, 25.6.1941 г. Захапіўшы Смаргонь, фашысты ўстанавілі ў горадзе і раёне жорсткі акупацыйны рэжым. Сялянскія гаспадаркі абкладаліся падаткам. Выкананне падатковых абавязкаў строга адсочвалася праз вясковых солтысаў і ў выпадку невыканання каралася акупацыйнымі ўладамі.

Напярэдадні прыходу немцаў Смаргонскія райком партыі і райвыканком былі эвакуіраваны. Разам з імі падаліся і іншыя кіруючыя работнікі-ўсходнікі, засталіся толькі мясцовыя. Яны стварылі 2 падпольныя групы. Адна з іх група Ручыцы, якая дзейнічала з пачатку 1942 г. да жніўня 1943 г., калі падпольпчыкі пацярпелі правал. Другая падпольная група была створана ў в. Залессе. І вось яны – старшыні сельсаветаў, калгасныя актывісты, дэпутаты, міліцыянеры – сталі першымі ахвярамі фашыстаў на акупіраванай Смаргоншчыне. У ліпені – жніўні 1941 г. фашысты фактычна расправіліся з савецкімі актывістамі.

Яшчэ адной бязлітаснай прыкметай акупацыі сталі канцэнтрацыйныя лагеры. Са жніўня 1941 па 1943 г. лагер

ваеннапалонных быў у Смаргоні. Знаходзіўся ён на тэрыторыі раённай бальніцы. Паводле сведчання мясцовых жыхароў там утрымлівалася прыкладна тысяча чалавек.

У лістападзе 1942 г. на базе атрадаў імя Суворава і «Знішчальнік» створана брыгада імя К.Я. Варашылава. Камандзірам брыгады прызначаны Ф.Р. Маркаў. Таксама на Смаргоншчыне дейнічаў атрад імя Фрунзе, яго камандзірам быў прызначаны капітан М.М. Міхайлюк, камісарам М.С. Чаракаеў, начальнікам штаба А.Я. Ільін. У 1943 г. ў паўночнай частцы Смаргонскага раёна дзейнічаў і асобны партызанскі атрад С.Р.Суслава, які быў арганізаваны ў 1942 г. ў Мінскай вобласці. Брыгада імя Гастэлы пачала дзейнічаць на тэрыторыі Смаргонскага раёна са снежня 1943 г. 2-я брыгада імя Суворава разгарнула сваю дзейнасць на тэрыторыі Смаргонскага раёна са студзеня 1944 г.

У чэрвені 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя – адна з найбольшых стратэгічных аперацый Чырвонай Арміі ў Вялікую Айчынную вайну. 4 ліпеня пачаўся другі этап Беларускай наступальнай аперацыі. У адпаведнасці з дырэктывай Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання войскі 3-га Беларускага фронту атрымалі загад: галоўны ўдар нанесці на Вільнюскім напрамку, дапаможны – на Лідскім.

Праз тэрыторыю Смаргонскага раёна наступалі тры арміі – 5-я пад камандаваннем генерал-палкоўніка М.І. Крылова, 11-я гвардзейская пад камандаваннем генерал-маёра К.М.Галіцкага і 5-я гвардзейская танкавая пад камандаваннем маршала бранятанкавых войск П.А.Ротмістрава.

Дывізіі 3-га корпуса ў 9 гадзін раніцы 4.7.1944 г. пачалі наступление на Смаргонь, і да 15.00 горад быў вызвалены. А 8 ліпеня 1944 г. Смаргонскі раён быў поўнасцю вызвалены. 4454 жыхароў горада Смаргоні загінула ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прапалі без звестак: 109 чалавек у горадзе і 872 чалавекі са Смаргоншчыны. У гонар воінаў, якія вызвалялі Смаргонь, за 4 км ад Смаргоні на правым беразе р. Вілія ў 1976 г. ўзведзены помнік – «Пераправа».